XV З’езд хірургаў Рэспублікі Беларусь, што праводзіўся 16-17 кастрычніка у г.Брэсце, сабраў 310 спецыялістаў з нашай рэспублікі, а таксама ўрачоў Украіны, Расіі, Польшчы, Германіі, Бельгіі, Малдовы, Літвы і Латвіі. У межах 8 секцыйных паседжанняў абмяркоўваліся пытанні кардыёхірургіі, гепатапанкрэатабіліярнай, таракальнай і агульнай хірургіі, трансплантагогіі, флебалогіі, колапракталогіі, інавацый у хірургіі. Супрацоўнікі кафедры агульнай хірургіі прымалі актыўны удзел у XV З’ездзе хірургаў.

Падчас адкрыцця З’езду прафесар кафедры агульнай хірургіі Г.П.Рычагоў, разам з іншымі выбітнымі дзеячамі айчыннай хірургічнай навукі і практыкі, быў узнагароджаны памятным знакам за шматгадовую дзейнасць на карысць айчыннай хірургіі і ў знак прызнання яго заслуг перад медычнай навукай Рэспублікі Беларусь. Таксама Г.П.Рычагоў у якасці асобы, што выконвае абавязкі старшыні АА “Беларуская Асацыяцыя Хірургаў” выступіў з прывітальным словам да дэлегатаў З’езду і справаздачай пра работу Беларускай Асацыяцыі Хірургаў.

Дэлегацыя кафедры, на чале з загадчыкам кафедры прафесарам Сяргеем Алякеевічам Аляксеевым, актыўна працавала ў межах навуковых секцый, прысвечаных праблемам сучаснай панкрэаталогіі, біліярнай хірургіі і гнойна-сэптычнай хірургіі. Прафесар С.А.Аляксееў быў мадэратарам секцыі “Дасягненні і нестандартныя сітуацыі ў неадкладнай хірургіі органаў брушной паражніны” (паседжанне 2), разам з прафесарамі С.А.Жыдковым і М.В.Завадай. Прафесар Г.П.Рычагоў, разам з прафесарамі В.І.Аверыным і А.І.Кавалевым (Масква) працаваў у якасці мадэратара секцыі “Дасягненні і нестандартныя сітуацыі ў неадкладнай хірургіі органаў брушной паражніны”, і ў межах таго ж паседжання выступіў з дакладам “Рэзультаты дыягностыкі і лекавання хворых на каларэктальны рак, што ускладнены абтурацыйнай кішэчнай непраходнасцю, у часовым аспекце”.

З вусным дакладам на тэму “Лапараскапічны і мінілапаратомны доступ у хірургіі жоўцевакаменнай хваробы, ускладненай механічнай жаўтухай” у секцыі “Эндаскапічная, барыятрычная і пластычная хірургія: дасягненні і перспектывы” выступіў асістэнт П.П.Кашэўскі (сааўтары: С.А.Аляксееў, І.Д.Семянчук, К.Л.Бейнар). Стэндавы даклад на тэму “Сіндром сістэмнай запаленчай рэакцыі ў пацыентаў з рожыстым запаленнем” прадставіла аспірант С.А.Клімук (сааўтары: А.В.Лапцэвіч, А.Г.Рымашеўскі; навуковы кіраўнік: прафесар С.А.Аляксееў).

У межах секцыі “Праблемы і дасягненні гепата-панкрэата-біліярнай хірургіі” спецыяльны госць з’езда, старшыня Бельгійскага з’адзіночання хірургаў, сузаснавальнік Еўрапейскага з’адзіночання хірургаў прафесар Люк

Мішэль прэзентаваў даклад «Modern diagnosis and treatment of acute necrotizing pancreatitis» (Сучасная дыягностыка і лекаванне вострага некратызуючага панкрэатыту). Раней, ў Менску, прафесар Л.Мішэль прачытаў дзве лекцыі для студэнтаў 3 курса лячэбнага факультэту БДМУ і ўсіх жадаючых на тэму сучаснага вядзеня закрытай траўмы жывата і пытанняў хірургічнага лекавання загрудзннага зобу.

Супрацоўнікі кафедры выказваюць найглыбейшую удзячнасць арганізатарам З’езду за прадстаўленную магчымасць удзелу ў знакавай для навуковай хірургічнай суполкі падзеі, і дзякуюць Камітэт за выдатную арганізацыю.